11. Чем и насколько духовенство может помочь правительству и обществу в занимающем их теперь вопросе об уменьшении пьянства в народе (окончание) // Минские епархиальные ведомости. – 1882. – № 13. – С. 349–355.

12. *Григорьев, А. Д.* Очерки истории социальной работы на Беларуси / А. Д. Григорьев. – Минск: БГПУ, 1998. – 291 с.

13. Попытки учреждения общества трезвости // Церковные ведомости, издаваемые при Святейшем Правительствующем Синоде. – 1890. – № 28. – С. 906–908.

14. Могилевские епархиальные ведомости. – 1913. – № 18. – С. 277–278.

15. *Мяньчэня, С. В.* Станаўленне таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. / С. В. Мяньчэня. – Пінск: ПолесГУ, 2018. – С. 105–110.

16. *Восович, С. М.* Роль православного духовенства в утверждении трезвого образа жизни в Беларуси во второй половине XIX – начале XX века / С. М. Восович // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2008. – № 1. – С. 9–11.

17. *Ганчар, А. И.* Римско-католический костел в Беларуси (1864–1905 гг.): монография / А. И. Гончар. – Гродно: ГГАУ, 2008. – 276 с.

**(Дата подачи: 28.02.2024 г.)**

*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. Samusik*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)“15/16”**

# АДАСАБЛЕННЕ КАНФЕСІЙНЫХ СІСТЭМ АДУКАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1580-Х – ПАЧАТКУ 1600-Х ГАДОЎ

# SEPARATION OF CONFESSIONAL EDUCATION SYSTEMS ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE LATE 1580S – EARLY 1600S

*Навуковы артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі праблеме адасаблення канфесійных сістэм адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1580-х – пачатку 1600-х гг. Прааналізавана стаўленне Жыгімонта III Вазы да асветніцкіх ініцыятыў пратэстантаў, праваслаўных і ўніятаў. Вызначаны прычыны часовага прыпынення адукацыйнай актыўнасці езуіцкага ордэна. Адзначана, што ў дадзены перыяд школьныя сеткі асобных канфесій пачалі набываць сістэмны характар – у іх з’явіліся кіруючыя органы, адзінае вучэбна-метадычнае забеспячэнне, афіцыйныя дазволы на дзейнасць з боку дзяржаўных улад.*

*Ключавыя словы: адукацыя; Жыгімонт III Ваза; езуіты; пратэстанцкія вучылішчы; праваслаўныя брацкія школы ў Брэсце, Мінску і Магілёве; уніяцкія семінарыі ў Брэсце і Вільні.*

*The scientific article is devoted to the undeveloped in historiography problem of separation of confessional education systems on the territory of Belarus in the late 1580s – early 1600s. The attitude of Zhigimont III Vasa to the educational initiatives of Protestants, Orthodox and Unionists is analyzed. The reasons for the temporary suspension of the educational activity of the Jesuit order have been determined. It is noted that in this period, school networks of individual denominations began to acquire a systemic character – they had governing bodies, unified educational and methodological support, and official permits for their activities from the state authorities.*

*Keywords: education; Zhigimont III Vasa; Jesuits; Protestant schools; Orthodox brotherhood schools in Brest, Minsk and Mogilev; union seminaries in Brest and Vilno.*

Правал у часы праўлення Стэфана Баторыя (1576–1586) ідэі аб арганізацыі агульнадзяржаўнай сістэмы адукацыі шмат у чым быў выкліканы імкненнем розных хрысціянскіх канфесій да арганізацыі ўласных школ. Прычым найперш яны адрозніваліся адна ад адной зместам духоўнага выхавання. У рэшце рэшт, зразумеў немагчымасць пераадолення рэлігійных супярэчнасцяў у краіне і сам кароль. Фактычна ён зняў перашкоды на асветніцкую дзейнасць пратэстантаў, а праваслаўным увогуле дазволіў паўсюдна адкрываць свае навучальныя ўстановы [1, с. 181–182]. Гэтым Стэфан Баторый стварыў спрыяльныя ўмовы для афармлення асобных канфесійных сістэм адукацыі, што і стала адметнай рысай эвалюцыі айчыннай школьнай справы ў наступныя дзесяцігоддзі.

На жаль, менавіта дадзены перыяд (канец 1580-х – пачатак 1600-х гг.) не знайшоў належнага асвятлення ў айчыннай гістарыяграфіі з пункту гледжання комплекснага аналізу поліканфесійнай спецыфікі развіцця адукацыі на тэрыторыі Беларусі. Азначанаму часу прысвечаны толькі даследаванні, дзе вывучалася станаўленне праваслаўных брацкіх школ [2, с. 70–74], а таксама спробы ўніятаў перахапіць у іх асветніцкую ініцыятыву [3, с. 87–90]. У выніку па-за межамі навуковага інтарэсу засталіся пытанні, звязаныя з вызначэннем прычын часовага прыпынення актыўнасці езуітаў і наданнем пратэстанцкай адукацыі арганізацыйнага характару.

Пры гэтым неабходна ўлічваць, што пасля смерці Стэфана Баторыя пачаўся перыяд бескаралеўя, які разам з першымі гадамі праўлення Жыгімонта ІІІ Вазы (1587–1588) адметны значным палітычным крызісам. Каталіцкая групоўка магнатаў і шляхты на чале з кн. М. Кр. Радзівілам Сіроткай выступала за абранне аўстрыйскага эрцгерцага Максіміліяна Габсбурга, але той прайграў і ў 1589 г. адмовіўся ад прэтэнзій на трон Рэчы Паспалітай. Гэта спрыяла ўзмацненню ў ВКЛ пратэстантаў, якіх пасля смерці ў 1584 г. кн. М. Радзівіла Рудага ўзначаліў яго сын – гетман польны ВКЛ кн. Кр. Радзівіл Пярун. Ён шмат увагі надаваў развіццю адукацыі і акрамя падтрымкі існуючых навучальных устаноў (Віленскай кальвінскай школы) у 1591 г. узвёў збор, школу і шпіталь у Беліцы Лідскага павета [4, арк. 32].

Яго прыкладу прытрымліваліся і іншыя заможныя пратэстанты. Віленскі кашталян Я. Кішка ў 1589 г. заклаў кальвінскі збор, школу, друкарню

і шпіталь у Любчы Навагрудскага павета [4, с. 34]. Збор са школай у Заслаўі былі створаны на сродкі кашталяна мінскага і ваяводы троцкага Я. Я. Глябовіча, у тастаменце якога ад 28 ліпеня 1590 г. адзначалася: «Міністар добрага бакалаўра мусіць наняць дзеля добрага і праўдзівага дзетак навучання» [5, с. 60]. У Варнянах Ашмянскага павета ваявода смаленскі Я. Абрамовіч у канцы XVI ст. утрымліваў вучылішча, дзе бясплатна вучылася 12 збяднелых юнакоў [6, с. 304].

У цэлым у 1590-я гг. на абшарах ВКЛ існавала 189 збораў і амаль пры кожным з іх працавала школа. Кіраваў імі рэгулярна збіраемы Сінод, па ініцыятыве якога ўсе яны былі падзелены на 6 дыстрыктаў: Віленскі (Вільня, Трокі, Ашмяны, Варняны, Беліца, Браслаў, Ліда і інш.), Панёманскі (Навагрудскі; Навагрудак, Ваўкавыск, Любча, Мазыр, Рэчыца, Слуцк і інш.), Завілейскі (Вількамір, Упіта, Коўна і інш.), Падляшскі (Заблудаў, Брэст, Гродна, Пінск, Слонім і інш.), Жмудскі (Кейданы і інш.) і Беларускі (Мінск, Віцебск, Заслаўе, Койданава, Мсціслаў, Орша, Полацк і інш.). На чале дыстрыктаў стаялі сеньёры і іх намеснікі Кансеньёры, якія абіраліся з апекуноў асобных школ, былых рэктараў і настаўнікаў [7, с. 148–151].

Лютэранскага веравызнання ў ВКЛ, пераважна, прытрымліваліся пражываючыя тут немцы. У пачатку XVII ст. у Вільні яны ўтварылі ўласную асветніцкую пляцоўку. Прычым улады афіцыйна дазволілі ўтрымліваць тут «містраў школьных», а будынак вучылішча вызваляўся ад вайсковых пастояў. Лепшыя мясцовыя выхаванцы адпраўляліся на вучобу ў Кенігсбергскі ўніверсітэт, дзе на іх утрыманне штогод выдзялялася некалькі стыпендый [8, с. 21, 46, 59].

Езуіты, у сваю чаргу, здолелі вярнуць сабе прыхільнасць Жыгімонта III Вазы – ён нават даў згоду на прысутнасць пры двары асобнай місіі ордэна з 10 манахаў і суперыёра. Духоўнікам і адным з бліжэйшых дарадцаў караля ў 1588–1612 гг. быў П. Скарга, якога той цаніў за шчырасць веры, красамоўства і разважлівасць [9, с. 46, 48]. Пры гэтым, аднак, пасля заснавання Нясвіжскага калегіўма ў 1584–1585 гг. новых асветніцкіх пляцовак у Рэчы Паспалітай езуіты не стваралі ажно 20 год. Чарговыя ордэнскія навучальныя ўстановы ўзніклі на каронных землях у Торуні (1605), Луцку (1608) і Львове (1608). Яшчэ даўжэй ніяк не праяўлялася іх адукацыйная ініцыятыва на тэрыторыі ВКЛ, дзе толькі ў 1616 г. быў адкрыты калегіум у Кражах на Жмудзі [10, с. 563–565, 591–592, 675–693, 931–935, 1002–1004].

Можна меркаваць, што прычын падобнага развіцця падзей некалькі. Папершае, створаныя да сярэдзіны 1580-х гг. калегіумы ўзнікалі па ініцыятыве біскупаў і заможных магнатаў-католікаў, якія апасаліся перамогі ў краіне Рэфармацыі. Надалей гэтая пагроза знікла і яны больш не спяшаліся з уласнымі ахвяраваннямі. Па-другое, згаданая «паўза» была выклікана вострым дэфіцытам выкладчыкаў, якіх нехапала нават на закрыццё ўжо існуючых вакансій. Так, у Нясвіжы курсы паэтыкі і рыторыкі з’явіліся толькі ў другой палове 1590-х гг. [11, с. 72]. У Полацку клас сінтаксісу быў

адкрыты ў 1593/1594 навучальным годзе, паэтыкі – у 1595/1596 навучальным годзе, а рыторыкі – у 1605/1606 навучальным годзе [12, с. 55].

Заняліся ордэнскія ўлады і ўдасканаленнем адміністрацыйнага дзялення Польскай правінцыі, у складзе якой у 1597 г. была сфарміравана асобная Літоўская віцэправінцыя. Гэта было першым крокам па надані ёй статусу правінцыі, які яна атрымала ў 1608 г. У той час ордэн яшчэ не страціў надзеі ўзяць пад уласны кантроль Кракаўскую акадэмію, а таму імкнуўся стварыць у Рэчы Паспалітай дзве прыблізна раўнавартасныя па навукова-педагагічным патэнцыяле адміністратыўныя адзінкі. Вынікам падобнай палітыкі стала далучэнне да Літоўскай правінцыі Варміі, Мазовіі, Падляшша, Інфлянтаў і Курляндыі – акрамя Вільні, Полацка і Нясвіжа ў яе складзе апынуліся калегіумы ў Брунсбергу, Варшаве, Пултуску, Плоцку, Драгічыне, Ломжы, Рызе і Дзерпце [13, с. 40–41].

Трэба таксама адзначыць, што менавіта ў азначаны час завяршылася справа кадыфікацыі нарматыўнай базы, якая рэгулявала функцыянаванне езуіцкіх навучальных установ. 8 студзеня 1594 г. V Генеральная кангрэгацыя ордэна зацвердзіла «Змест і асноўныя прынцыпы навучання», апублікаваны першы раз у 1599 г. Згодна яму ствāралася дакладная сістэма кіраўніцтва школьнай справай, былі выпрацаваны адзіныя падыходы для правядзення заняткаў і ўжывання вучэбнай літаратуры, вызначаліся абавязкі настаўнікаў ды іх вучняў [14, с. 59–67].

Скарысталіся ўразлівасцю пазіцыі Жыгімонта III Вазы і праваслаўныя. Для атрымання падтрымкі магнатаў, належачых да гэтай канфесіі, кароль сярод іншага задавальняў хадайніцтва айчынных брацтваў наконт адкрыцця імі ўласных школ. Так, 21 ліпеня 1589 г. ён зацвердзіў статут Віленскага праваслаўнага брацтва, у якім асобна адзначалася: «В школе теж братской детей братии уписное и убогих сирот езыка и писма руского, греческого, латынского и польского накладом братским дармо учити повинны… Также и людей вписме учоных особ духовных и светских для науки школьное… ховати мают…» [15, с. 10].

У наступныя гады манарху вострa патрабаваліся саюзнікі на соймах, а таму ён задаволіў цэлы шэраг падобных хадайніцтваў, пададзеных яму сенатарамі і дэпутатамі праваслаўнага веравызнання (К.(В.) К. Астрожскі, Ф. Скумін-Тышкевіч і інш.). Так, 28 студзеня 1591 г. ён пацвердзіў дазвол епіскапа ўладзімірскага і брэсцкага М. Храптовіча (дадзены 6 ліпеня 1590 г.) на адкрыццё брацкай школы ў Брэсце – вызваліў яе «от всяких платов наших господарских и местских… так теж от стоянья всякого стану людей…» і асобна падкрэсліў: «Мы господарь видечи в том чоломбитье их слушное, и тот порядок их в збудованью школы и старанью о науку и цвиченье детем малым народу хрестианского не только к доброму и пожиточному того места Берестейского, але и всей речи посполитой учиненый…» [16, с. 38–39]. 11 верасня 1592 г. паводле каралеўскага прывілея мінчане атрымалі права «для науки деток малых школу мети и бакаляра в ней ховати, и там детей письма Греческого и Русского учити давати» [16, с. 54]. 21 сакавіка 1597 г.

Жыгімонт III Вазы ўхваліў статут Магілёўскага брацтва пры Спаскім манастыры – між іншага яму дазвалялася трымаць школу «к оздобе и помножению хвалы Божое и порядков слушных захованья», у якой «детей братьи уписной и убогих сирот языка и письма Словеньского, Русского, Греческого, Латинского и Польского накладом братским дармо учити повинны… также и людей в письме учоных, особ духовных и светских… до проповеди слова Божого до науки детей и до спеванья… ховати маем» [16, с. 172].

Неабходна адзначыць, што брацкія школы таксама паступова набывалі выгляд адзінай структуры. Пастановамі царкоўных Сабораў у Брэсце ад 22 чэрвеня 1590 г. і 27 кастрычніка 1591 г. брацкія школы ў Львове і Вільне прызначаліся саборнымі з манапольным правам на адукацыйную дзейнасць ва ўласных гарадах і кантролем над іншымі аналагічнымі навучальнымі ўстановамі. Пры гэтым апошнія павінны былі кіравацца іх школьнымі статутамі: «везде единакие Братства будут» [17, с. 19–21]. Разам з тым віленскі «Чин» 1584 г. больш увагі ўдзяляў арганізацыі саміх брацтваў, а таму ў сферы праваслаўнай адукацыі пашыраўся львоўскі «Школьны парадак» 1586 г., які больш падрабязна распісваў пабудову вучэбна-выхаваўчага працэсу. Вядома, што менавіта ён быў пераняты ў Брэсце – у каралеўскім прывілеі ад 28 студзеня 1591 г. мелася наступнае ўдакладненне: «Позволили есьмо им… братство духовное, прикладом места нашого Львовского мети…» [16, с. 38–39]. У красавіку 1597 г. копіі нарматыўных дакументаў са Львова былі дасланы і ў Магілёў, дзе мясцовыя мяшчане «взявши, ведлуг в них описаних порядков, свое братство Могилевское справовали…» [18, с. 57–58].

Разам з тым у далейшым кароль спыніў падтрымку айчынных брацкіх школ, бо ўніяцкая царква распачала стварэнне ўласнай адукацыйнай справы. Прычым яе іерархі лічылі цалкам законным рабіць гэта праз перахоп кантролю над ужо існуючымі праваслаўнымі навучальнымі ўстановамі. Улады аказвалі ім у гэтым падтрымку. 26 чэрвеня 1597 г. Жыгімонт III Ваза выдаў прывілей аб перадачы епіскапу ўладзімірскаму і брэсцкаму І. Пацею вучылішчных будынкаў у Брэсце: «Абы в школе Руской… лепшый порядок и наука быти могла» [16, с. 175–176]. Выкладаць у ёй даў згоду ўраджэнец в. Корфу і выхаванец Рымскай Грэчаскай калегіі П. Аркудый, якому каралеўскім рашэннем ад 23 жніўня 1599 г. перадавалася в. Таракань пад Драгічынам: «на содержание во время отправления учительской должности в Брестской школе». Гэтая вёска давалася яму: «До живота своего, не будучи повинен нам и никому иншому жадной повинности с того села полнити, опроч, кгды коллегиум альбо семинариум для науки людей молодых религии Греческой там заложено будет… повинен будет научати их, ведучи до добрых обычаев и веры старожитной Греческой, под послушенством костела повшехного Римского» [16, с. 195–196].

Аднак справа да адкрыцця ўніяцкага вучылішча ў Брэсце так і не дайшла. І. Пацей у 1599 г. стаў кіеўскім мітрапалітам, што прымусіла яго

клапаціцца аб дабрабыце ўсёй царквы. У выніку ён вырашыў сканцэнтравацца на стварэнні буйнага асветнага асяродка ў Вільні, бо такім чынам спадзяваўся пры дапамозе мясцовых езуітаў знішчыць сталічную праваслаўную брацкую школу. Доказам такой змены прыярытэтаў стала грамата Жыгімонта III Ваза ад 20 снежня 1613 г., у якой адзначалася, што І. Пацей «упросил был у нас село Тороканы, в повете Пинском лежачое, на школу Берестейскую, которое-то школы не заложивши с сего света зшол». Па гэтай прычыне загадвалася: «тым селом подперти» Віленскі Троіцкі манастыр, бо «в оном значне прибывает людей законных, в побожности и в науках вызволеных поступуючих…» [19, с. 10–11].

Уніяцкая семінарыя ў Вільні распачала працу ў 1601 г. Яе рэктарам («старшым») быў прызначаны «прыдворны духоўнік» мітрапаліта П. Федаровіч-Сурамятнікаў [20, арк. 4]. Аднак у 1602 г. ён раптоўна памёр і на першы план выйшаў І. В. Руцкі – ураджэнец м. Рута пад Навагрудкам, выхаванец Віленскай кальвінскай гімназіі, Пражскай акадэміі, універсітэта ў Вюрцбург і Грэчаскай калегіі ў Рыме. Менавіта ён здолеў пераўтварыць гэтую навучальную ўстанову ў буйны асветны цэнтр. Па словах яго біёграфа Ф. Турука, «то силой благочестиваго слова, то примером своих добродетелей, собирает около себя значительный отряд знатных юношей (вучылася тут каля 100 юнакоў, сярод якіх быў і І. Кунцэвіч. – *А. С.*)» [21, с. 22, 25–26].

Пры гэтым трэба адзначыць, што дзейнасць Віленскай уніяцкай семінарыі не перашкодзіла сталічным праваслаўным братчыкам працягваць уласную адукацыйную дзейнасць. Па суседству з адабраным у іх дэкрэтам Жыгімонта III Вазы ад 22 мая 1596 г. Троіцкім манастыры яны ўзвялі Свята-Духаўскую абіцель, якая стала новым месцам знаходжання брацкай школы. Прычым знішчыць яе не рашыўся нават канцлер ВКЛ кн. Л. Сапега, бо апасаўся значных хваляванняў сярод гараджан [22, с. 304–306].

Калі ж улічыць, што непадалёк ад уніяцкай і праваслаўнай навучальных устаноў дзейнічалі таксама езуіцкая акадэмія з калегіўмам, кальвінская гімназія і лютэранскае вучылішча, то можна цалкам правамоцна ўспрымаць сталіцу ВКЛ у пачатку XVII ст. яскравым увасабленнем поліканфесійнага характару ўсёй тагачаснай айчыннай адукацыйнай справы.

У цэлым не выклікае сумненняў тое, што адукацыйная дзейнасць розных хрысціянскіх канфесій у азначаны перыяд істотна актывізавалася. Езуіты на дадзены момант яшчэ не прэтэндавалі на дамінуючае месца ў айчыннай школьнай справе, але іх рэлігійныя супернікі адчувалі нарастаючую пагрозу і імкнуліся максімальна засцерагчы адзінаверцаў ад уплыву ордэна. Зрабіць гэта было магчыма толькі прадаставіўшы маладому пакаленню альтэрнатыўнае езуіцкаму выхаванне ва ўласных навучальных установах. Улады прытрымліваліся на той момант тактыкі «рэлігійнага міру» і не перашкаджалі падобным асветніцкім ініцыятывам. У выніку менавіта ў канцы 1580-х – пачатку 1600-х гг. канфесійныя школьныя сеткі на тэрыторыі Беларусі пачалі набываць сістэмны характар, які вызначыў далейшы шматвектарны напрамак развіцця айчыннай адукацыі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Самусік, А. Ф.* Адукацыйная справа на тэрыторыі Беларусі ў часы праўлення караля Стэфана Баторыя (1576–1586 гг.) / А. Ф. Самусік // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст.: в 4 ч. / под ред. В. А. Гайсёнка [и др.]. – Минск: РИВШ, 2022. – Вып. 22, ч. 2. – С. 176–184.

2. *Березкина, Н. Ю.* Просветительская деятельность православных братств в XVI–XVII вв. / Н. Ю. Березкина // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. – 2018. – Вып. 21. – С. 69–78.

3. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.

4. Літоўская нацыянальная бібліятэка імя М. Мажвідаса. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (ЛНБММ АРКіР). – Ф. 93. Спр. 5.

5. Тастамент Яна Глябовіча, ваяводы троцкага / перакл. А. Унучака // Спадчына. – 2003. – № 1. – С. 58–66.

6. *Соколов, И. И.* Отношение протестантизма к России в XVI и XVII веках / И. И. Соколов. – М.: Тип. Э. Лисснер и Ю. Роман, 1880. – 450 с.

7. *Bem, K.* Ustroje kościołów ewangelicko reformowanych w Rzeczypospolitej Obojga Narodów na przełomie XVI i XVII wieku / K. Bem // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – 2013. – T. 57. – S. 123–153.

8. *Adamowicz, A. F.* Kościół Augsburski w Wilnie: kronika zebrana na obchód trzechwiekowego istnienia Kościoła w roku 1855 w dzień Ś. Jana Chrzciciela / A. F. Adamowicz. – Wilno: Druk. J. Zawadzkiego, 1855. – 70 s.

9. *Mariani, A.* Aktywność jezuickich kapelanów nadwornych prowincji litewskiej. Między ustawodawstwem zakonnym a praktyką / A. Mariani // Rocznik Lituanistyczny. – 2015. – Vol. 1. – S. 37–82.

10. *Załeski, S.* Jezuici w Polsce: w 5 t. / S. Załeski. – Lwow; Krakow: Druk. W. Anczyca i Spolki, 1900–1906. – T. 4: Dzieje 153 kolegiów i domów Jezuitów w Polsce. – Cz. 2: Kolegia i domy założone w pierwszej dobie rządów Zygmunta III 1588–1608. – 1905. – S. 483–1019 s.

11. *Харлампович, К.* Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань: Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.

12. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

13. *Natoński, B.* Szkolnictwo jezuickie w Polsce w dobie Kontrreformacji / B. Natoński // Z dziejów szkolnictwa jezuickiego w Polsce: Wybór artykułów / oprac. J. Paszenda. – Kraków: Wyd-wo WAM-Księża Jezuici, 1994. – S. 34–62.

14. *Górecki, A.* O jezuickiej ratio studiorum / A. Górecki // Christianitas. – 2014. – № 58. – S. 58–69.

15. Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам = Zbiòr dawnych dyplomatow i aktow miast: Wilna, Kowna, Trok, prawosławnych monasterów, cerkwi i w różnych sprawach: в 2 ч. – Вильно: Тип. А. Марциновского, 1843. – Ч. 2. – 208 с.

16. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 4: 1588–1632 гг. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1851. – VIII, 529 с.

17. *Mironowicz, A.* Bractwa cerkiewne Rzeczypospolitej / A. Mironowicz. – Białystok: Bractwo Prawosławne Sw.Sw. Cyryla i Metodego, 2003. – 214 s.

18. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси: в 14 т. – Вильно, 1867–1904. – Т. 2. – Вильно: Печатня Губернского правления, 1867. – XV, 258 с.

19. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 5: 1633–1699 гг. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1853. – VII, 288 с.

20. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 249.

21. *Турук, Ф.* Униатский митрополит Иосиф Вельямин Рутский (1613–1637) и его значение в истории униатской западной русской церкви / Ф. Турук. – Петроград: Сенатская типография, 1916. – 41 с.

22. *Жукович, П.* Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г.) / П. Жукович. – СПб.: Типография Главного Управления Уделов, 1901. – 594 с.

**(Дата падачы: 16.02.2024 г.)**

*О. И. Сенькевич*
Белорусский государственный университет физической культуры, Минск

*A. Siankevich*
Belarusian State University of Physical Culture, Minsk

**УДК 94:323.1(476):706.034.2"192/193"**

# ПОЛИТИКА ГОСУДАРСТВА В СФЕРЕ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ И СПОРТА НА ТЕРРИТОРИИ БССР В 1920–1930 ГГ.

# STATE POLICY IN THE FIELD OF PHYSICAL EDUCATION AND SPORTS IN THE TERRITORY OF BELARUS IN 1920–1930

*Статья посвящена изучению процесса становления государственной системы управления физической культурой и спортом в период модернизации общества 1920–1930 гг. Выделены основные направления государственной политики в указанной сфере. Проанализированы конкретные мероприятия, осуществленные Высшим советом физической культуры БССР. Отмечено стремление создать концепцию «пролетарской физической культуры» и противопоставить ее «буржуазному спорту».*

*Ключевые слова: Высший совет физической культуры; коллектив физической культуры; милитаризация физического воспитания; добровольное спортивное общество.*

*The article is devoted to the study of the process of formation of the state system of management of physical culture and sports during the period of modernization of society in 1920–1930. The main directions of state policy in this area are highlighted. Specific activities carried out by the Supreme Council of Physical Culture of the BSSR are analyzed. The desire*